ISSN 2221-5204

НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ

# АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ АНТРОПОЛОГИИ

**Выпуск 20**

НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
Институт истории

# АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ АНТРОПОЛОГИИ

Сборник научных трудов

*Основан в 2007 году*

Выпуск 20

Минск
«Беларуская навука»
2025

pawet.net

*УДК 903.7"13"*

*А. І. ДЗЯРНОВІЧ*

*Аддзел гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў і археаграфіі,*
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ЗАГІНУЦЬ НА БЕРАГАХ НЁМАНА: «ЧАЛАВЕК З СЕНТ-БІС» І ПРАБЛЕМА ІДЭНТЫФІКАЦЫІ СЯРЭДНЯВЕЧНЫХ ПАХАВАННЯЎ

У артыкуле апісаны прыклад комплекснага міждысцыплінарнага даследавання, падчас якога была праведзена паспяховая ідэнтыфікацыя двух асоб з сярэднявечнага пахавання ў прыяраце Сент-Біс (графства Камбрыя, Англія) – барона Энтані дэ Люсі і яго сястры Мод. У 1981 г. у крыпце былога бенедыктынскага манастыра былі знойдзены два пахаванні – добра захаванае цела мужчыны ў свінцовым саркафагу і шкілетаваныя парэшткі жанчыны. Вызначэнне асоб пахаваных стала магчымым дзякуючы правядзенню археалагічных, генеалагічных, геральдычных і мастацтвазнаўчых даследаванняў артэфактаў з прыярата Сент-Біс, а таксама дзякуючы комплекснаму антрапалагічнаму аналізу чалавечых астанкаў. Мэтай артыкула з'яўляецца аналіз выкарыстаных метадаў з улікам звестак наратыўных крыніц па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Падчас антрапалагічнага даследавання, акрамя класічных метадаў, выкарыстоўваліся таксама біягеахімічны (ізатопны) і радыевугляродны аналізы. Канчатковае вызначэнне асобы, абставінаў смерці і пахавання стала магчымым дзякуючы аналізу пісьмовых дакументальных крыніц Англіі і наратыўных помнікаў ордэнскага летапісання. Наяўнасць гістарычных звестак дазваляе сцвярджаць, што ў сярэдзіне XIV ст. прадстаўнікі арыстакратыі і дваранства Англіі рэгулярна ўдзельнічалі ў паходах Тэўтонскага ордэна на паўночна-заходнія землі Вялікага Княства Літоўскага. У 1367–1368 гг. у склад такой экспедыцыі ўваходзіла група прадстаўнікоў эліты графства Камбрыя. Прамыя і ўскосныя крыніцы сведчаць аб тым, што барон Энтані дэ Люсі быў не толькі адным з удзельнікаў, але і арганізатарам гэтай экспедыцыі.

**Ключавыя словы:** экспансія Тэўтонскага ордэна, англійская эліта, Вялікае Княства Літоўскае, архітэктурна-археалагічныя даследаванні, ізатопны аналіз, радыевугляродны аналіз.

## Уводзіны

Працяглая канфрантацыя Тэўтонскага ордэна з Вялікім Княствам Літоўскім на працягу канца XIII – пачатку XV ст. стала вынікам ваеннай экспансіі ордэнскай арганізацыі і гаспа-

дарчай каланізацыі паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Балтыйскага мора з боку паўночна-нямецкіх гарадоў. Заваяванне прускіх плямёнаў распачалося ў 1225 г., калі Конрад Мазавецкі звярнуўся да Ордэна з прапановай узяць ўдзел у пакарэнні прусаў. Апошняй з прускіх зямель немцамі была заваяваная Судовія, якая знаходзілася на паўднёвым усходзе прускага этнічнага абшару. У 1283 г. Ордэн выйшаў непасрэдна да межаў Літвы. Ордэнскі храніст Пётр з Дусбурга адлюстраваў гэтую падзею ў паведамленні, што прусы спынілі супраціў пасля таго, як апошні незалежны правадыр яцвягаў Скурда са сваімі ваярамі ў 1283 г. сышоў у Літву [4, № 219, с. 137; 35, № 219 (214), p. 146]. Менавіта гэты сыход фіксуе факт заваявання немцамі Прусіі, што замацавалася ў гістарыяграфіі [1, с. 50; 2, с. 79; 3, с. 414].

Тэўтонскі Ордэн, прынамсі ад 1320 г., актыўна выкарыстоўваў ў сваіх рэйдах заходнееўрапейскіх рыцараў, якія скіроўваліся ў Прусію і далей на Усход з мэтай атрымання ці ўдасканалення вайсковага досведу ды выканання, як яны лічылі, свайго хрысціянскага абавязку па ўдзеле ў хрышчэнні язычнікаў [33, s. 11].

Адзін з падобных рэйдаў быў арганізаваны вялікім маршалам і комтурам Кёнігсберга Г. Шындэкопам напрыканцы зімы 1364 г. Маршал меў намер ісці на аблогу Гародні, спрабуючы напасці «на рутэнаў» [47, s. 316]. Гэты рэйд быў адметны тым, што ў ім бралі ўдзел англійскія рыцары. Паход на Гродна праходзіў вельмі жорстка [47, s. 318], спусташэнні ваколіц горада падчас гэтага рэйду апісвае Я. Длугаш [18, p. 322; 19, s. 406]. Але завяршыўся паход нечакана. Гарадзенскі князь уступіў у перамовы з маршалам Ордэна, прывёўшы з сабой жанчын і дзяцей, і зладзіў пачастунак півам з мёдам, як гэта было «прынята ў русінаў» [47, s. 318]. Такім чынам, замест знішчэння паганскага паселішча адбылося частаванне ў хрысціянскім горадзе. Пір выступае тут у якасці сацыяльна-палітычнага спосабу вырашэння канфлікту, але непасрэднай прычынай спынення паходу супраць Гародні стаў, як аказалася, нечаканы для рыцараў-«гасцей» хрысціянскі статус гэтага горада. У эпізодзе рэйду 1364 г. на Гародню звяртае на сябе ўвагу ўдзел у гэтай акцыі рыцараў з Англіі і Шатландыі.

У 1981 г. у прыяраце Сент-Біс (графства Камбрыя, Англія) былі знойдзены астанкі ўнікальна захаванага цела прадстаўніка мясцовай арыстакратыі XIV ст. У выніку праведзенага комплекснага міждысцыплінарнага даследавання была здзейснена паспяховая ідэнтыфікацыя асобы пахаванага. Ім аказаўся барон Энтані дэ Люсі, які прымаў удзел ў Крыжовым паходзе на паўночна-заходнія землі Вялікага Княства Літоўскага і загінуў у 1368 г. у ваколіцах літоўскага замка Новае Коўна. Пасля смерці цела барона было дастаўлена ў прыярат Сент-Біс і там пахаванае.

Мэтай артыкула з'яўляецца аналіз выкарыстаных метадаў даследавання з улікам звестак наратыўных крыніц па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

## Асноўная частка

***Археалагічныя даследаванні абацтва Сент-Біс.*** У 1979–1981 гг. у графстве Камбрыя на паўночным захадзе Англіі супрацоўнікамі Лестэрскага ўніверсітэта праводзіліся архітэктурна-археалагічныя даследаванні комплекса былога кляштара Сэнт-Біс (St. Bees Priory). У нашыя дні гэта парафіяльная англіканская царква. Бенедыктынскі кляштар быў заснаваны тут першым нармандскім лордам Эгрэмонта Уільямам дэ Мішэнам і асвечаны арцыбіскупам Йоркскім Турстанам паміж 1120 і 1135 гг. [41, p. I–V].

Прыярат Сент-Біс Святой Марыі і Святой Бегі ўваходзіў у структуру Йоркскага абацтва Святой Марыі. У 1539 г. прыярат быў распушчаны ў выніку працэсу секулярызацыі кляштараў падчас Англіканскай Рэфармацыі [40, NA SC 6/HENVIII/7382; 42, p. 23–24; 43, p. 97–108]. Апошнім прыёрам быў Д. Р. Пэдзі (D. R. Paddy) [41, p. 608]. А ўжо 21 лістапада 1540 г. уладанні зліквідаванага кляштара былі перададзены каралём у арэнду свайму збраяносцу Т. Лейгу [41, p. 598–600].

Археалагічныя даследаванні 1979–1981 гг. праводзіліся з мэтай выяўлення слядоў пабудовы данармандскага перыяду. Кіраўніцтва даследаваннямі ажыццяўлялі Д. О'Саліван (D. O'Sullivan) і Дж. Тод (J. Todd). Увагу даследчыкаў прыцяг-

нула разбураная бакавая капліца, размешчаная на поўдзень ад асноўнага алтара. Разбураны стан капліцы адлюстраваны і на самых ранніх выявах прыярата – малюнках 1639 г. невядомага мастака і гравюры братоў Самуэля і Натаніэля Бакаў 1739 г. [6, № 35]. Падчас даследавання руін паўднёвай капліцы ў 1981 г. была выяўлена крыпта памерам 1,3 × 2,5 м, а ў ёй знойдзены два пахаванні – мужчынскае і жаночае.

***«Чалавек з Сент-Біс».*** Цела мужчыны было загорнута ў свінцовую пласціну і пакладзена ў драўляную труну. Паколькі асоба пахаванага была невядомая, яе акрэслілі як «чалавек з Сент-Біс» ("St. Bees Man"). У пласце былі выяўлены фрагменты керамічнага посуду XIV ст. [39, p. 275–277]. Гэтыя даціроўкі супадаюць з часам пабудовы паўднёвай алтарнай капліцы. Нягледзячы на тое, што свінцовы футляр быў пашкоджаны ў раёне ног, цела чалавека выдатна захавалася. Апроч гэтага, нябожчык быў абгорнуты ў два саваны, якія ўяўлялі сабой звычайныя ільняныя палотны, прамочаныя смалістым рэчывам.

Цела неадкладна было дастаўлена ў морг шпіталя Заходняга Камберленда. Для правядзення экспертызы быў запрошаны доктар Э. Тап (E. Tapp), палеапатолаг з Каралеўскага шпіталя ў Прэстане, вядомы сваёй працай з егіпецкімі муміямі. Экспертыза паказала, што ўсе ўнутраныя органы былі на месцы і не пашкоджаны [44]. Добра захаваліся ўсе скурныя пакровы, пазногці, валасы, унутраныя органы. У грудной поласці мелася вадкая кроў. Ацалеў таксама страўнік з яго змесцівам – там знаходзіліся рэшткі аўсянай кашы з разынкамі. Чалавек з Сент-Біс меў кароткія, пасівелыя валасы і бараду, вочы захавалі радужную абалонку. На далонях праглядаліся дэрматагліфічныя лініі.

З-за добрай захаванасці цела была ўстаноўлена прычына смерці, а таксама стан здароўя мужчыны, які памёр ва ўзросце каля 40 гадоў. Прычынай смерці, хутчэй за ўсё, стаў гематаракс, выкліканы моцным ударам ў грудную клетку; правае лёгкае было прабіта зламаным сёмым рабром. Акрамя таго, рэнтгенаўскія здымкі паказалі, што ў мужчыны была зламаная сківіца, выкліканая ўдарам з правага боку; меўся таксама пералом пад'язычнай косткі. Усе гэтыя траўмы былі нанесеныя неза-

доўга да смерці, паколькі не было выяўлена ніякіх прыкмет рэгенерацыі костак. З іншых паталогій даследчыкі адзначылі цяжкі абсцэс з-за няўдалага выдалення зуба, а таксама моцны ацёк машонкі. У нябожчыка былі моцна сцёртыя зубы, меўся таксама запушчаны абсцэс, выкліканы няўдалай спробай выдаліць адзін з зубоў.

***Прычыны захаванасці цела***. Медыкі прыйшлі да высновы, што выключная захаванасць цела чалавека з Сент-Біс не была абумоўлена вядомымі метадамі кансервацыі, такімі як высушванне, бальзаміраванне ці выдаленне ўнутраных органаў. Захаванасць цела таксама не была абумоўлена пахаваннем у выключна вільготных, кіслотных умовах, як у выпадку са шматлікімі «балотнымі людзьмі», ці выключнай сухасцю, як у выпадку з егіпецкімі муміямі.

Прычынай добрай захаванасці цела стала супольнае ўздзеянне свінцовай абалонкі, з-за якой не было доступу вільгаці, і насычанага смалістым рэчывам савана, што выключыла доступ паветра. Першапачаткова рэчыва-кансервант на саване было вызначана як пчаліны воск [38, p. 114]. У 2010 г. былі праведзены аналізы частак савана метадамі газавай храматаграфіі і мас-спектраметрыі, якія паказалі прысутнасць смалы, змешанай з алеем або тлушчам. Смала была нагрэта (маюцца сляды рэтэну – вуглевадароду), таму, верагодна, гэта была хваёвая смала, падобная да той, якую выкарыстоўвалі для апрацоўкі карпусоў караблёў. У такіх умовах адбываўся гідроліз нейтральных тлушчоў мяккіх тканак, што ператварыла іх у тлустыя кіслоты, якія адкладаліся ў тканінах у выглядзе крышталікаў. Гэтыя хімічныя працэсы падкіслялі і абязводжвалі тканіны, забіваючы бактэрыі, якія звычайна выклікаюць гніенне, і выпрацоўваючы гліцэрын, які дзейнічаў як кансервант.

***Жаночае пахаванне «Sk100».*** У крыпце побач са свінцовым футлярам знаходзілася жаночае пахаванне «Sk100». Даследаванне канструкцыйных асаблівасцей крыпты паказала, што праз нейкі час пасля пахавання чалавека з Сент-Біс першапачатковая ніша была дадаткова пашырана на 0,56 м для размяшчэння драўлянай труны. У выніку атрымалася, што свінцовы саркафаг

чалавека з Сент-Біс застаўся ляжаць на каменнай выбрукоўцы, а труна з пахавання «Sk100» – проста на зямлі. Размяшчэнне двух пахаванняў побач сведчыла пра тое, што паміж нябожчыкамі пры іх жыцці магла існаваць блізкая сувязь.

У пахаванні «Sk100» адсутначалі косткі рук і ніжнія часткі ног. Прыжыццёвая даўжыня цела жанчыны, рэканструяваная па выніках вымярэння правай плечавой косткі паводле метаду Тротэр і Глэзер [26, p. 308], склала (160,9 ± 5,16) см, што блізка да сярэднявечнай жаночай нормы каля 159 см [36, p. 49–50], і крыху ніжэй, чым сярэдняя даўжыня цела сучасных жанчын у Вялікабрытаніі (163,15 см) [20, p. 287; 39, p. 279]. Узрост жанчыны ў момант смерці складаў не менш за 36–45 гадоў [39, p. 279].

У 2010 г. распачаўся новы этап даследаванняў шкілета «Sk100» з выкарыстаннем метадаў ізатопнага аналізу і радыевугляроднага датавання. Ізатопны аналіз зубной эмалі з мэтай вызначэння ўтрымання стронцыю і свінцу дазваляе выявіць геаграфічны рэгіён паходжання чалавека [5, p. 135–187]. Для вывучэння «Sk100» былі ўзяты эмаль і дэнтын з левага верхняга другога маляра. Канцэнтрацыя свінцу і суадносіны ізатопаў былі атрыманы з дапамогай мас-спектаметрыі з індуктыўна-звязанай плазмай высокага распазнавання (Nu Instruments Nu Plasma), а канцэнтрацыя стронцыю і суадносіны ізатопаў – пры дапамозе мас-спектарметрыі з тэрмічнай іанізацыяй (Finnigan Triton). У выніку даследавання было ўстаноўлена, што жанчына з пахавання «Sk100» вырасла на трыясавым чырвоным пясчаніку, характэрным для мясцовасці Сент-Біс, і паходзіла, такім чынам, з рэгіёна, дзе і была пахаваная [27, p. 282–283]. Колькасць свінцу ў зубной эмалі жанчыны з пахавання «Sk100» значна перавышала натуральны ўзровень, што супадае з паказчыкамі іншых англічан XV ст. [25, p. 45–58; 32, p. 1247–1255; 39, p. 282–283].

Фрагменты костак чэрапа, галёнкі і рэбраў былі ўзятыя для аналізу стабільных ізатопаў вугляроду і азоту, што дазволіла атрымаць сведчанні аб рацыёне харчавання жанчыны з «Sk100» [37, p. 290–300]. Атрыманыя вынікі сведчаць аб рацыёне з вялікім утрыманнем жывёльнага пратэіну з істотным кампанентам марской рыбы [28, p. 692]. Параўнанне з вялікім аб'ёмам

дадзеных з Гільбертынскага прыярата паказала, што дадзеныя з пахавання «Sk100» размяшчаюцца сярод асоб з найбольшымі значэннямі стабільных ізатопаў 13C і 15N ва ўсёй папуляцыі [29, p. 134, 168]. Гэта сведчыць аб тым, што жанчына з пахавання мела прывілеяваны рацыён і валодала высокім сацыяльным статусам [39, p. 284].

Для правядзення радыевугляроднага датавання быў узяты дыяфіз сцегнавой косткі шкілета «Sk100». З дапамогай праграмы Calib 5.02 узроставы дыяпазон быў адкалібраваны ў прамежку ад 1301 да 1407 г. (імавернасць – 95,4 %) [39, p. 287].

Такім чынам, ізатопныя аналізы паказалі, што жанчына з пахавання ў крыпце была мясцовай жыхаркай і правяла сваё дзяцінства ў рэгіёне Сент-Біс. Яе рацыён змяшчаў вялікі працэнт бялка, атрыманага з марской рыбы, што сведчыць аб высокім сацыяльным статусе жанчыны. Абставіны пахавання таксама ўказваюць на яе элітнае паходжанне. Радыевугляродныя вызначэнні даюць дату пахавання ў дыяпазоне 1301–1407 гг.

***Генеалагічныя і геральдычныя даследаванні.*** Ідэнтыфікацыя асобаў, пахаваных у прыяраце Сент-Біс, стала магчымай дзякуючы аналізу архіўных матэрыялаў. Адпраўной кропкай гістарычных даследаванняў стала вывучэнне трох надмагільных скульптур, якія знаходзіліся ў паўднёвый алтарнай прыбудове яшчэ ў XVIII ст., ужо пасля канструктыўнага разбурэння гэтай часткі прыярата. Большасць падобных скульптур у Англіі датуецца XIII–XIV стст. [45, p. 126]. Дзве скульптуры належаць рыцарам, адна – жаночая, якая захавалася найлепш, у тым ліку часткова захаваліся абрысы галавы і твару.

Таксама былі знойдзены малюнкі і апісанні скульптур, выкананыя ў XVII ст. [39, p. 293–294]. У апісанні гісторыі і старажытнасцей графстваў Уэстэрмаленд і Камберленд, зробленым у 1777 г. антыкварам Д. Нікалсанам і юрыстам Р. Бёрнам, узгадваецца, што ў паўднёвай прыбудове знаходзілася драўляная скульптура Энтані, апошняга лорда Люсі Эгрэмонта, і «калі гэта яго сапраўдная выява, то яна паказвае, што гэты чалавек меў буйны целасклад і быў вышэйшы за 6 футаў» (каля 1,82 м) [31, p. 41].

У паўночным трансэце царквы была знойдзена надмагільная пліта з жаночага пахавання. Пліта памерамі 132 × 61 см знаходзіцца пад перакрыццем уваходнага праёма ў капліцу, але, як мяркуецца, яна была перамешчаная са свайго першапачатковага месца. На пліце выяўлена дарослая жанчына, прычоска і адзенне якой дазваляе датаваць выяву больш познім часам, чым аналізаваныя вышэй мемарыяльныя скульптуры [17, p. 48–49]. У рамцы па перыметры пліты захаваўся пашкоджаны лацінскі надпіс, змест якога перакладаецца наступным чынам: «Тут ляжыць Ёганна Люсі. Няхай Бог памілуе яе. Амэн». Ёганна была дачкой лорда Энтані дэ Люсі [7, p. 325; 30, p. 303], які загінуў падчас Крыжовага паходу ў 1368 г. Вядома, што Ёганна дэ Люсі памерла ў маладым узросце (30 верасня 1369 г.) з-за эпідэміі чумы ў Камбрыі [22, p. 172; 39, p. 302].

Ва ўсходняй сцяне вежы-званіцы царквы быў знойдзены фрагмент каменнага геральдычнага шчыта, які ўтрымліваў выявы трох рыб у адной чвэрці шчыта, і ільва ў іншай чвэрці. Гэта была левая (у геральдычным сэнсе) частка аб'яднанага герба, дзе ў ніжнім сектары знаходзіцца герб баронаў Пэрсі – «нястрыманы блакітны леў»; у верхнім сектары – герб баронаў дэ Люсі «тры срэбныя шчупакі». Гэты герб узнік у выніку заключанага ў 1383 г. шлюбу Генры Пэрсі і Мод дэ Люсі, сястры лорда Энтані [14, p. 150]. Шлюб гэты у ледзі Мод быў другім, і ўступала яна ў яго ў статусе 5-й баранэсы дэ Люсі. Ледзі Мод стала трымальніцай баронскага тытулу ў 1369 г. – пасля смерці сваіх братоў і маленькай пляменніцы Ёганны дэ Люсі. Шлюб баранэсы Мод быў бяздзетным, такім чынам, яна стала апошняй прадстаўніцай роду дэ Люсі.

Праведзеныя комплекныя гістарычныя, антрапалагічныя і біягеахімічныя даследаванні дазволілі зрабіць выснову, што жаночы шкілет «Sk100» належаў менавіта Мод дэ Люсі, якая пражыла каля 55 гадоў. Цела ледзі Мод у 1398 г. было пакладзена ў крыпту яе брата Энтані дэ Люсі ў царкве прыярата Сент-Біс. Энтані дэ Люсі загінуў за 30 год да гэтага, у 1368 г., і быў пахаваны з выкарыстаннем незвычанага спосабу кансервацыі. Род дэ Люсі лічыўся апекуном прыярата Сент-Біс, таму туды і быў дастаўлены

свінцовы саркафаг Энтані. Ледзі Мод, як бяздзетная і трымальніца баронскага тытулу дэ Люсі, таксама была пахаваная ў крыпце свайго роду. Вядома, што еўрапейскія сярэднявечныя знатныя жанчыны часцей былі пахаваныя з мужамі, ад якіх яны мелі дзяцей, гэта значыць з наяўнымі спадчыннікамі, у той час як жанчыны, якія памерлі без нашчадкаў, часцей былі пахаваны з членамі свайго, паводле паходжання, роду [46, p. 385].

Версія пра магчымасць пахавання побач з Энтані дэ Люсі ягонай жонкі Джаан была адхілена на ранніх этапах генеалагічнага даследавання. Вядома, што ўдава Энтані дэ Люсі Джаан Фіц-Генры яшчэ раз выйшла замуж за Мэцью дэ Рэдмана (гэта быў яе трэці шлюб). Яна памерла 1 верасня 1403 г. у Клеркенуэлле, паўночным прадмесці Лондана [15, p. 194]. Паколькі Джаан выйшла замуж у чарговы раз пасля смерці Энтані, яна не магла быць пахаваная побач са сваім памерлым былым мужам. Апроч таго, узрост Джаан Фіц-Генры на момант смерці быў значна большы, чым узрост, вызначаны па астанках «Sk100».

***Энтані дэ Люсі і яго Крыжовая выправа.*** Абставіны жыцця Энтані дэ Люсі аказаліся дастаткова добра дакументаванымі. Энтані атрымаў у спадчыну маёнткі свайго бацькі Томаса ў 1365 г. і прыняў на сябе яго абавязкі па ахове англа-шатландскай мяжы. Як можна зразумець, падчас зацішша ў памежных войнах, Энтані дэ Люсі атрымаў каралеўскі дазвол пакінуць Англію. Дзеля фінансавання выправы ён пазычыў значную суму ў 600 фунтаў у фаварыткі караля Алісы Перэрс, афармленне здзелкі было закончана 21 лістапада 1367 г. [8, p. 396]. Але яшчэ 20 лістапада 1367 г. у Вестмінстэры Энтані дэ Люсі была выдадзена каралеўская ліцэнзія на «выправу за моры» і прызначэнне дзвюх пaverаных на час адсутнасці яго ў Англіі цягам аднаго года [12, p. 34]. У іншым запісе ад 20 лістапада 1367 г. пра патэнт на адбыццё з порта Дуўр указваецца, што Энтані дэ Люсі адбывае з 15 вершнікамі і ўжо 500 фунтамі на іх утрыманне [12, p. 57]. Гэта была найбольшая світа і фундуш, зафіксаваныя ў англійскіх выправах у «прускія рэйды» ў 1367–1368 гг. [22, p. 186]. У запісе пра патэнт Энтані дэ Люсі не быў указаны пункт прызначэння, але на гэтым жа тыдні, а таксама ў той жа дзень (20 лістапада),

былі выдадзены партовыя патэнты на адплыццё з Дуўра «у Прусію», у тым ліку для кузэна Энтані Джона дэ Мултана (John de Multon) [12, p. 57–58], які таксама пазычыў грошы ў Алісы Перэрс [8, p. 396]. Джон дэ Мултан быў сынам Джона дэ Мултана з Фрэмптана і знаходзіўся пад апекай бацькі Энтані дэ Люсі, таму цалкам верагодна, што яны выхоўваліся ў адной сям'і.

Джон дэ Мултан пакінуў прамыя сведчанні пра ўдзел Энтані дэ Люсі ў «прускім рэйдзе». У архіве Мултан-хола былі знойдзены лісты Джона дэ Мултана да сваёй жонкі. 23 лістапада 1367 г. ён паведамляў, што ў гэты ж дзень ён накіроўваецца ў Прусію разам з Энтані дэ Люсі і Рычардам дэ Уэлбі, і што спадзяецца вярнуцца з «вялікай выгодай і гонарам» [16, p. 199–200].

Храніст Нямецкага ордэна Віганд з Марбурга паведамляе, што ў пачатку 1367 г. у Ніжнім Панямонні разам з ордэнскімі аддзеламі ўжо дзейнічалі англійскія рыцары [47, p. 350]. Сярод правадыроў англійскага аддзела называюцца барон Бамонт і Уолтар барон Фіц-Уолтар [47, p. 351], якія знаходзіліся ў сваяцкіх сувязях з Энтані дэ Люсі: мачаха Энтані дэ Люсі паходзіла з Бамонтаў, а Уолтар барон Фіц-Уолтар быў яшчэ адным кузэнам Энтані [39, p. 300].

Энтані дэ Люсі ўжо не вернецца са сваёй «прускай выправы» на ВКЛ. Запісы пра яго гібель у 1368 г. былі зроблены ў картулярыях (скарочаных актавых копіях) «Інквізіцыі пасля смерці» – інстанцыі, якая займалася разбіральніцтвам маёмасных правоў пасля смерці ўладальніка. Спадчынныя пытанні Энтані дэ Люсі разглядаліся вельмі аператыўна – 10 кастрычніка 1368 г. [9, № 233], а таксама звярталіся да разгляду справы 19 лютага 1375 г. [11, № 169]. У гэтых актах існуюць супярэчнасці адносна дат гібелі Энтані дэ Люсі, пазначаюцца – 19 жніўня і 16 верасня [22, p. 185–186]. Але ў любым выпадку – гэта канец лета – пачатак восені 1368 г. Апроч таго, адзначаецца, што Энтані дэ Люсі «загінуў за марамі» [11, № 169].

З гэтай жа выправы не вярнуўся і спадарожнік Энтані дэ Люсі Джон дэ Мултан. Справы яго спадчыннасці разглядаліся «Інквізіцыяй пасля смерці» 8 лістапада 1368 г. [9, № 300] і 4 лютага 1373 г. [10, № 269]. Розныя даты гібелі «ў заморскіх

краях» фігуруюць таксама і ў выпадку з дэ Мултанам: 18 жніўня і 29 верасня 1368 г. Так ці інакш, даты смерці Джона дэ Мултана і Энтані дэ Люсі ўкладаюцца ў сціслы храналагічны перыяд. Апроч таго, паводле крыніц мы маем імя яшчэ аднаго англійскага рыцара, які загінў падчас рэйду на ВКЛ, верагодна ў 1368 г. У кастрычніку 1367 г. Роджэр дэ Фэлбрыг атрымаў каралеўскі патэнт на выезд з Англіі, і ў пазнейшых крыніцах яго імя ўжо не сустракаецца [22, p. 186–187]. Але на мармуровай пліце ў нішы замацавана мемарыяльная табліца, усталяваная ягоным сынам Сайманам у царкве Святой Маргарыты ў Фэлбрыгу, у інскрыпцыі якой было пазначана, што ён «памёр у Прусіі і там пахаванае яго цела» [24, p. 274].

Звесткі пра ўдзел Энтані дэ Люсі ў крыжовых выправах цыркулявалі сярод рэгіянальных англійскіх эліт яшчэ ў XV ст. У радаводзе баронаў Грэйстокаў, уладанні якіх знаходзіліся таксама ў графстве Камбрыя, паведамлялася, што Энтані здзейсніў вандраванне ў Terra Sancta (Святую Зямлю) [13, p. 301]. У 1351–1352 гг. Уільям Грэйсток браў удзел у Крыжовай выправе ў Прусію на чале з Генры Гросмантам [21, p. 93–94]. Гэтая акалічнасць, а таксама сваяцкія сувязі паміж лакальнай элітай, паўплывалі на тое, што імя Энтані дэ Люсі было ўнесена ў апісанне радаслоўнай Грэйстокаў. Прыгадка Terra Sancta тут можа быць праінтэрпратавана як сведчанне таго, што Энтані дэ Люсі «ўсклаў на сябе крыж» – стаў удзельнікам крыжовай выправы.

На працягу 1367–1368 гг. асноўныя падзеі ваеннага супрацьстаяння паміж Нямецкім ордэнам і ВКЛ разгортваліся вакол Новага Коўна, літоўскага замка, закладзенага на нёманскай выспе Віргален, каля вусця Нявяжы ў Нёмане, ніжэй сучаснага Каўнаса [47, p. 352–354]. Менавіта Новае Коўна лічыцца верагодным месцам гібелі трох англійскіх рыцараў у верасні 1368 г. [23, p. 92; 34, s. 117, tabl. 56].

Наяўнасць гістарычных звестак дазваляе сцвярджаць, што ў сярэдзіне XIV ст. прадстаўнікі арыстакратыі і дваранства Англіі рэгулярна ўдзельнічалі ў выправах Нямецкага ордэна на паўночна-заходнія землі ВКЛ, найперш у Сярэднім і Ніжнім Панямонні. У 1367–1368 гг. у такой выправе ўдзельнічала, у тым

ліку, група прадстаўнікоў эліты графства Камбрыя. Прамыя і ўскосныя крыніцы дазваляюць сцвярджаць, што не толькі адным з удзельнікаў, але і арганізатарам гэтай выправы быў Энтані дэ Люсі, 3-і барон Люсі.

## Высновы

Працы па ідэнтыфікацыі чалавека з Сент-Біс можна назваць класічным прыкладам комплекснага міждысцыплінарнага даследавання, у якім былі задзейнічаны археалагічныя, генеалагічныя, геральдычныя, мастацтвазнаўчыя і антрапалагічныя метады, а таксама ўлічаны вынікі біягеахімічных і радыевуглярodных аналізаў. Поспех у ідэнтыфікацыі персаналій Энтані дэ Люсі (чалавек з Сент-Біс) і Мод дэ Люсі («Sk100») стаў магчымым менавіта ў выніку ўдалага выкарыстання метадаў розных навук. Пасля завяршэння даследаванняў можна таксама дакладна апісаць тыя фізіка-біялагічныя ўмовы, якія спрыяюць добраму захаванню парэштак людзей эпохі Сярэднявечча і выпрацаваць методыкі іх уратавання і вывучэння.

У выпадку з аналізам шкілета Мод дэ Люсі можна казаць пра выкарыстанне метаду остэабіяграфічнага падыходу, сутнасць якога заключаецца ў выкарыстанні чалавечых парэштак для высвятлення сацыяльнай ролі чалавека ў даўніх супольнасцях, таго, як сацыяльныя змены адлюстроўваюцца ў іх пахавальным рэжыме, і яго актыўнай ролі ў сацыяльна-палітычных зменах. У такіх абставінах цела і яго фунеральная рэпрэзентацыя становяцца артэфактам і палатном для выяўлення сімвалічнага і сацыяльнага статусу.

Адначасова, выяўленне і даследаванне парэштак чалавека з Сент-Біс з'яўляецца важным удакладненнем да ацэнкі маштабаў экспансіі Тэўтонскага (Нямецкага) ордэна на землі ВКЛ у канцы XIII – пачатку XIV ст., калі для ажыццяўлення рэйдаў выкарыстоўваліся рыцары-«пілігрымы» з іншых рэгіёнаў Еўропы, у прыватнасці, з Англіі. Можна сцвярджаць, што прысутнасць прадстаўнікоў англійскіх эліт ў рэйдах Нямецкага ордэна на ВКЛ у другой трэці XIV ст. была рэгулярнай.

# Літаратура і крыніцы


1. *Очерки* истории Восточной Пруссии / В. Г. Кретинин, В. Н. Брюшинкин, В. И. Гальцов [и др.]. ; авт. введ. А. И. Кузнецов. – Калининград : Янтарный Сказ, 2002. – 533 с.

2. *Пашуто, В. Т.* Борьба прусского народа за независимость (до конца XIII в.) / В. Т. Пашуто // История СССР. – 1958. – № 6. – С. 54–81.

3. *Пашуто, В. Т.* Образование Литовского государства / В. Т. Пашуто. – М. : АН СССР, 1959. – 536 с.

4. *Пётр* из Дусбурга. Хроника земли Прусской / подг. В. И. Матузова. – М. : Ладомир, 1997. – 384 с.

5. *Bentley, R. A.* Strontium isotopes from the earth to the archaeological skeleton: a review / R. A. Bentley // Journal of Archaeological Method and Theory. – 2006. – Vol. 13, № 3. – P. 135–187.

6. *Buck's* antiquities; or venerable remains of above four hundred castles, monasteries, palaces, &c. &c. in England and Wales. With near one hundred views of cities and chief towns / by Messrs. Samuel and Nathaniel Buck ; 3 vol. – London : Printed by D. Bond, 1774. – Vol. I. – VIII. – 224 p.

7. *Burke, J.* A general and heraldic dictionary of the peerages of England, Ireland, and Scotland, extinct, dormant, and in abeyance / J. Burke. – London : H. Colburn and R. Bentley, 1831. – 631 p.

8. *Calendar* of Close Rolls, Edward III / ed. H.C. Maxwell Lyte. – London : Originally published by His Majesty's Stationery Office, 1910. – Vol. 12 : A. D. 1364–1369. – 674 p.

9. *Calendar* of Inquisitions Post Mortem / M. C. B. Dawes, J. B. W. Chapman. – London : by His Majesty's Stationery Office, 1938. – Vol. 12 : Edward III. – XXIX, 603 p.

10. *Calendar* of Inquisitions Post Mortem / A. E. Stamp, J. B. W. Chapman, M. C. B. Dawes, D. B. Wardle. – London : by His Majesty's Stationery Office, 1954. – Vol. 13 : Edward III. – 437 p.

11. *Calendar* of Inquisitions Post Mortem / A. E. Stamp, J. B. W. Chapman, C. Flower [et al.]. – London : Her Majesty's Stationery Office, 1952. – Vol. 14 : Edward III. – 580 p.

12. *Calendar* of the patent rolls preserved in the Public Record Office : Edward III / prepared under the superintendence of the Deputy Keeper of the Records. – London : Printed for H. M. Stationery Off., 1913. – Vol. XIV : A. D. 1367–1370. – 756 p.

13. *Chartularium* abbathiae de Novo Monasterio ordinis Cisterciensis fundatae anno MCXXXVII / ed. J. T. Fowler. – Durham : Published for the Society by Andrews, 1878. – Vol. XXII. – 340 p.

14. *Cokayne, G.* The Complete Peerage of England, Scotland, Ireland, Great Britain and the United Kingdom: Extant, Extinct, or Dormant / G. Cokayne. – London : St. Catherine Press, 1910. – Vol. I–XXXVIII, 504 p.

15. *Cokayne, G. C.* The Complete Peerage or a History of the House of Lords and All of its Members from the Earliest Times / G. C. Cokayne ; ed. H. A. Doubleday, D. Warrand, Lord H. de Walden. – London : The St. Catherine Press, 1926. – Vol. 6. – 729 p.

16. *Coss, P.* The Foundations of Gentry Life: The Multons of Frampton and their World, 1270–1370 / P. Coss. – Oxford : Oxford University Press, 2010. – XII. – 323 p.

17. *Coss, P.* The Lady in Medieval England, 1000-1500 / P. Coss. – Mechanicsburg, PA : Stackpole Books, 1998. – 214 p.

18. *Dlugossi*, Ioannis. Annales seu cronicae incliti Regni Poloniae / J. Długosz. – Varsaviae : PWN, 1978. – Liber nonus – 506 p.

19. *Długosz, J.* Roczniki czyli Kroniki sławnego Królestwa Polskiego / J. Długosz. – Warszawa : PWN, 2009. – Ks. 9. – 486 s.

20. *Eveleth, P. B.* Worldwide Variation in Human Growth / P. B. Eveleth, J. M. Tanner. – Cambridge : Cambridge University Press 1976. – 397 p.

21. *Fowler, K. A.* The King's lieutenant: Henry of Grosmont, First Duke of Lancaster, 1310–1361 / K. A. Fowler. – New York : Barnes &amp ; Noble, 1969. – 312 p.

22. *Grant, A.* The St. Bees lord and lady, and their lineage / A. Grant // North-West England from the Romans to the Tudors : essays in memory of John Macnair Todd. Extra series № XLI / ed. Keith J. Stringer. – Carlisle : Cumberland and Westmorland Antiquarian and Archaeological Society, 2014. – Vol. XVIII. – 288 p.

23. *Herman* de Wartbrge. Chronicon Livoniae / Hrsg. Ernst Strehlke // Scriptores rerum Prussicarum. – Leipzig : S. Hirzel, 1863. – Bd. II. – P. 9–178.

24. *Housley, N.* The crusading movement, 1274–1700 / N. Housley // The Oxford Illustrated History of the Crusades / ed. J. Riley-Smith. – Oxford : Oxford University Press, 1997. – P. 260–293.

25. *Human* lead exposure in England from approximately 5500 BP to the 16th century / P. Budd, J. Montgomery, J. Evans, M. Trickett // Science of The Total Environment. – 2004. – 5 January. – Vol. 318, iss. 1–3. – P. 45–58.

26. *Krogman, W. M.* The Human Skeleton in Forensic Medicine / W. M. Krogman, M. Y. Iscan / 2nd edn. – Springfield (IL) : Charles C. Thomas, 1986. – 551 p.

27. *Montgomery, J.* Strontium and oxygen isotope analysis of burials from Wasperton, War-wickshire / J. Montgomery, J. A. Evans, C. A. Chenery // Wasperton : A Roman, British and Anglo-Saxon Cemetery in Central England / ed. M. O. H. Carver, C. Hills, J. Scheschkewitz. – Woodbridge : Boydell and Brewer, 2009. – P. 46–49.

28. *Müldner, G.* Stable isotope evidence for 1500 years of human diet at the city of York, UK / G. Müldner, M. P. Richards. – American Journal of Physical Anthropology. – 2007. – Vol. 133 (1). – P. 682–697.

29. *Müldner, G.* Diet and diversity at later medieval Fishergate: the isotopic evidence / G. Müldner, M. P. Richards. – American Journal of Physical Anthropology. – 2007. – Vol. 134. – P. 162–174.

30. *Nicolas, N. H.* The historic peerage of England / N. H. Nicolas, W. Courthope. – London : John Murray, 1857. – 610 p.

31. *Nicolson, J.* The History and Antiquities of the Counties of Westmorland and Cumberland / J. Nicolson, R. Burn. – London : W. Strachan and T. Cadell, 1777. – Vol. 2. – 629 p.

32. *O'Connell, T. C.* Isotopic comparison of hair, nail and bone: modern analyses / T. C. O'Connell, R. E. M. Hedges, M. A. Healey // Journal of Archaeological Science. – 2001. – Vol. 28. – P. 1247–1255.

33. *Paravicini, W.* Die Preußenreisen des europäischen Adels / W. Paravicini. – Sigmaringen : Thorbecke, 1989. – Teil 1. – 396 S.

34. *Paravicini, W.* Die Preußenreisen des europäischen Adels / W. Paravicini. – Sigmaringen : Thorbecke, 1995. – Teil 2. – 346 s.

35. *Petri* de Dusburg. Chronicon terrae Prussiae / Hrsg. M. Toeppen // Scriptores Rerum Prussicarum. – Leipzig : Verlag von S. Hirzel, 1861. – Bd. I. – P. 5–219.

36. *Schweich, M.* Diachronic effects of bio-cultural factors on stature and body proportions in British archaeological populations. The impact of living conditions, socio-economic, nutritional and health status on growth, development, maximum attained stature and physical shape in archaeological skeletal population samples / Department of Archaeological Sciences, University of Bradford. – Bradford, 2005. – 244 p.

37. *Sealy, J.* Beyond lifetime averages – tracing life-histories through isotopic analysis of different calcifie d tissues from archaeological human skeletons / J. Sealy, R. Armstrong, C. Schrire // Antiquity. – 1995. – Vol. 69. – P. 290–300.

38. *Tapp, E.* St. Bees Man: did he fall or was he pushed? / E. Tapp. // Proceedings of the Institute of Maxillo-Facial Technology and International Ocular Prosthesis Workshop 1980–1982. – Roehampton : Department of Oral and Maxillo-Facial Surgery, Queen Mary's Hospital, 1985. – P. 113–126.

39. *The Identity* of the St Bees Lady, Cumbria: An Osteobiographical Approach / Ch. J. Knüsel, C. M. Batt, G. Cook [et al.] // Medieval Archaeology. – 2010. – Vol. 54, iss. 1. – P. 271–311.

40. *The National* Archives (UK). Special Collections. Northumberland, Cumberland, Westmoreland and Yorkshire : Monastic Possessions of dissolved religious houses. Account of sale of goods of dissolved religious houses. – Feb. 30 – Oct. 31. – Henry VIII. – NA SC 6 / HEN VIII/7382. – URL: https://discovery.nationalarchives.gov.uk/results/r?_ser=SC+6&id=C13524&_q=SC6%2FHenry+VIII%2F7382 (date of access: 25.01.2025).

41. *The Registers* of St. Bees Priory / ed. J. Wilson // Publications of the Surtees Society. – Durham : The Surtees Society, 1915. – Vol. 126. – XXXIX, 661 p.

42. *Todd, J. M.* St. Bega: Cult, Fact and Legend / J. M. Todd // Transactions of the Cumberland and Westmorland Antiquarian and Archaeological Society. New series. – 1980. – Vol. LXXX. – P. 23–35.

43. *Todd, J. M.* The pre-Conquest church in St Bees, Cumbria: a possible minster? / J. M. Todd // Transactions of the Cumberland and Westmorland Antiquarian and Archaeological Society. Series 3. – 2003. – Vol. 3. – P. 97–108.

44. *Todd, J. M.* The St Bees Man and the Medieval Way of Death / Lecture text by Dr. John Todd. – URL: https://stbees.org.uk/home/village/st-bees-man/john-todd/ (date of access: 25.01.2025).

45. *Tummers, H. A.* Early Secular Tomb Effigies in England : The Thirteenth Century / H. A. Tummers. – Leiden : E. J. Brill, 1980. – 196 p.

46. *Weiss-Krejci, E.* Mortuary representations of the noble house: A cross-cultural comparison between collective tombs of the ancient Maya and dynastic Europe / E. Weiss-Krejci // Journal of Social Archaeology. – 2004. – Vol. 4 (3). – P. 368–404.

47. *Wigand* von Marburg. Nowa kronika pruska / Opr. Sławomir Zonenberg, Krzysztof Kwiatkowski. – Toruń : TNT, 2017. – 666 s.

*A. DZIARNOVICH*

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## TO PERISH ON THE BANKS OF THE NIOMAN (MEMEL) RIVER: "THE ST. BEES MAN" AND THE PROBLEM OF IDENTIFYING MEDIEVAL BURIALS

The article describes an example of a complex interdisciplinary study that successfully identified two individuals from a medieval burial in St Bees Priory (Cumbria, England) – Baron Anthony de Lucy and his sister Maud. In 1981, two burials were discovered in the crypt of a former Benedictine monastery – the well-preserved body of a man in a lead sarcophagus and the skeletonised remains of a woman. The identification of the buried persons was made possible through archaeological, genealogical, heraldic and art history studies of artefacts from St Bees Priory, as well as through a comprehensive anthropological study of the human remains. The aim of the article is to analyse the methods used, taking into account the information from narrative sources on the history of the Grand Duchy of Lithuania. In the course of anthropological research, in addition to classical methods, biogeochemical (isotopic) and radiocarbon analyses were also used. The final establishment of the identity, circumstances of death and burial became possible thanks to the analysis of written documentary sources of England and narrative monuments of the Order's chronicle.

The availability of historical data allows us to assert that in the middle of the 14th century representatives of the aristocracy and nobility of England regularly participated in the campaigns of the Teutonic Order to the north-western lands of the Grand Duchy of Lithuania. In 1367–1368 such an expedition included a group of representatives of the elite of the county of Cambria. Direct and indirect sources testify that Baron Anthony de Lucy was not only one of the participants but also the organizer of this expedition.

**Keywords:** expansion of the Teutonic Order, English elite, Grand Duchy of Lithuania, architectural and archaeological research, isotope analysis, radiocarbon analysis.

*Пастуліла 13 снежня 2024 г.*

# СОДЕРЖАНИЕ

## I. ИСТОРИЧЕСКАЯ АНТРОПОЛОГИЯ

*Марфина О. В.* Создание и развитие белорусской антропологической школы. . . . . . . . . . 3

*Герасимова М. М., Харламова Н. В., Рашковская Ю. В.* О бланках и программах исследования в краниологии и одонтологии . . . . . . . . . . 18

*Гурбо Т. Л.* К истории изучения краниологического материала с территории пограничья Беларуси и Литвы (исследования второй половины XIX в. Э. А. Вольтера и Р. Шлюпаса). . . . . . . . . . 36

*Гурко А. Викт.* О некоторых особенностях трансляции элементов китайской культуры в процессе распространения китайских психофизических практик в Беларуси . . . . . . . . . . 54

*Гурко А. Вл.* Православные праздники в духовной культуре современного белорусского общества. . . . . . . . . . 67

*Денисевич А. А.* Особенности профессиональной подготовки бакалавров и интегрированных магистров в области антропологии в университетах Великобритании. . . . . . . . . . 77

*Дзярновіч А. І.* Загінуць не берагах Нёмана: «чалавек з Сент-Біса» і праблема ідэнтыфікацыі сярэднявечных пахаванняў. . . . . . . . . . 92

*Емельянчик О. А.* Опыт дифференциации разновременных погребений при Спасо-Преображенском храме Спасо-Евфросиниевского монастыря в г. Полоцке . . . . . . . . . . 108

*Каминская Д. С.* Одонтологические патологии городского населения Беларуси XI–XIX вв. (сравнительный анализ). . . . . . . . . . 125

*Касперович Г. И.* Динамика численности и этническая структура населения Республики Беларусь . . . . . . . . . . 140

*Крумплевский В. С.* Динамика рождаемости населения Видзовского католического прихода Браславского уезда Виленской губернии в начале XIX в. (по данным метрических книг) . . . . . . . . . . 151

*Ершова О. И.* Антропологический подход к образованию. . . . . . . . . . 162

*Захарова Н. Е.* Эволюционная психология в системе антропологических факторов экологической культуры. . . . . . . . . . 175

*Лазаревич Н. А.* Методы социально-жизненной адаптации в условиях глобальных пандемических процессов. . . . . . . . . . 189

*Рафикова А. Р.* Ценностное отношение к внешнему облику у белорусских студенток в зависимости от специфики получаемой профессии . . 200

*Фирсова К. И.* Смертность детского и юношеского населения г. Пскова по данным палеоантропологии и исторической демографии . . . . . . . . . 214

*Шершнёва О. А.* Проблема безумия и границ человеческого бытия: историко-философская рефлексия. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 227

## II. БИОЛОГИЧЕСКАЯ АНТРОПОЛОГИЯ

*Полина Н. И.* Динамика результатов психологического тестирования, отражающих вегетативный статус у школьников г. Полоцка в начале XXI в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
*Винникова В. Е.* Морфология длинных костей скелета населения местечка Белыничи XVII–XIX вв. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
*Герасевич А. Н., Пархоц Е. Г.* Возрастные аспекты морфофункционального развития детей г. Бреста среднего школьного возраста в начале XXI в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265
*Мезен Н. И., Гурбо Т. Л., Сахно И. П., Карасёва Е. И., Чаплинская Е. В.* Межполовые и межэтнические различия в антропометрическом статусе и восприятии гармоничности формы тела у студентов-медиков . . . . 280
*Ольховская Ю. А.* Причины увеличения биологического возраста у пожилых людей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 291
*Осипова Е. В., Винникова В. Е.* Опыт применения методов биологической антропологии в работе с останками времен Второй мировой войны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 304
*Писарик В. М., Ростовцев В. Н.* Антропология гуманизма. . . . . . . . . . . 312
*Помазанов Н. Н.* Изменения значений кефалометрических признаков в период дебрахикефализации у детей и подростков г. Полоцка в конце XX – начале XXI в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 323
*Рзаева Ю. В., Боом А. В.* Антропометрические показатели детей первого года жизни, проживающих на территориях разного уровня урбанизации . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 338
*Синева И. М., Белов К. И.* Особенности вариабельности ритма сердца у студентов с учетом телосложения . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
*Скриган Г. В., Гурбо Т. Л.* Основные показатели физического развития в двух последовательных поколениях современных белорусов (родители – дети) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 369
*Хохлов Н. В., Дзини С.* Определение цвета волос при исследовании рязано-окских могильников (V–VI вв.) методами УФ-спектрографии, хроматографии и колористики . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 379

## НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

**Наши юбиляры** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 393
Маргарита Михайловна Герасимова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 393

**Правила оформления статей** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 397

**Положение о рецензировании статей** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 402